Алена Смірнова

Метадыст Гродзенскай
абласной навуковай бібліятэкі
імя Я.Ф. Карскага



# ПУБЛІЧНЫЯ ЦЭНТРЫ ПРАВАВОЙ ІНФАРМАЦЫІ – ПАТРАБАВАННЕ ЧАСУ

21 лютага ў дзяржаўнай установе культуры «Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага» адбыўся абласны навучальны семінар па пытаннях, звязаных з дзейнасцю публічных цэнтраў прававой інфармацыі па фарміраванні прававой культуры грамадзян.

У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці, упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, супрацоўнікі публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) абласной і публічных бібліятэк Гродзенскай вобласці.

Адкрываючы семінар, намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (НЦПІ) Віктар Аляксандравіч Шаршун адзначыў важную ролю ПЦПІ ў фарміраванні інфармацыйна-прававой прасторы і прадастаўленні свабоднага доступу грамадзян да эталоннай прававой інфармацыі.

У межах навучальнага семінара прагучалі выступленні па найбольш актуальных і перспектыўных напрамках дзейнасці ПЦПІ.

Вольга Пятроўна Баркоўская, начальнік аддзела аналізу і маркетынгу НЦПІ, прадставіла інфармацыю аб выкарыстанні паслуг Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі ў публічных цэнтрах прававой інфармацыі Гродзенскай вобласці, а таксама дала рэкамендацыі па павышэнні эфектыўнасці іх работы ў сферы прадастаўлення актуальнай інфармацыі грамадзянам. Прыемна адзначыць, што Гродзенская вобласць з'яўляецца лідарам у рэспубліцы па колькасці створаных ПЦПІ – 97, што складае 22% ад агульнай колькасці публічных бібліятэк Гродзеншчыны.

З некаторымі асаблівасцямі выкарыстання інфармацыйна-пошукавай сістэмы «Эталон» пазнаёміў удзельнікаў семінара вядучы спецыяліст упраўлення распаўсюджвання прававой інфармацыі НЦПІ Вячаслаў Мечыслававіч Бякета. Ён таксама прадэманстраваў магчымасці інтэрнэт-паслугі «ЭТАЛОН-ONLINE», якая з'яўляецца электроннай копіяй Эталоннага банка даных прававой інфармацыі ў складзе інфармацыйна-пошукавай сістэмы «Эталон» (ІПС ЭТАЛОН 6.1) і складае каля 160 тыс. дакументаў.

Загадчык сектара даведкава-аналітычнай работы і інфармацыйных рэсурсаў Ірына Адамаўна Чупракова правяла прэзентацыю эксперыментальнага праекта пад назвай «Акадэмія прававой культуры», які пад эгідай Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь стартаваў у бібліятэках горада Мінска. Дакладчык расказала, якім чынам праходзіць набор у групы акадэміі, якія блокі заняткаў праводзяцца. Пасля заканчэння акадэміі праводзіцца праверка ўзроўню сфарміраванасці прававой культуры падлеткаў.

Вялікую цікавасць выклікала прэзентацыя электронных гульняў «Права і мы» і «У лабірынце права», распрацаваных супрацоўнікамі Навагрудскай ЦБС. Малышчык В.П., бібліёграф Навагрудскай ЦБ, падкрэсліла, што гэтыя рэсурсы вельмі папулярныя сярод дзяцей і падлеткаў, добра спрыяюць павышэнню прававой культуры маладога пакалення. Веды, атрыманыя праз камп'ютар, лёгка засвойваюцца. Прадстаўнікі НЦПІ ўнеслі прапанову размясціць гульні на дзіцячым прававым сайце www.mir.pravo.by.

Падчас семінара былі вызначаны перспектывы далейшага супрацоўніцтва па забеспячэнні свабоднага доступу кожнага жыхара да прававой інфармацыі, што будзе садзейнічаць праваому выхаванню грамадзяніна, які ведае, разумее і паважае законы сваёй краіны.

Summary

*The article tells about a training seminar on the activity* of public centers of legal information centers while forming the legal culture of citizens.